иностранных языков МАИ-НИУ; Ответственный редактор Аникеева И.Г. Москва, 2016: 130 – 140.

5. Ломако С.В. Внедрение инновационных технологий в учебный процесс. IV Международная научно-практическая конференция «Инновационные процессы и корпоративное управление». 15 – 30 марта, 2012 г., Минск.

УДК 378.147.018.43:004

## Праблемы і перспектывы дыстанцыйнага навучання: першыя высновы з вопыту працы

Мяцельскі А.А., Гіруцкая Л.А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Пераход на дыстанцыйнае навучанне ўспрымаецца не толькі як выклік сённяшняму дню, як вымушаная мера, але і як інавацыя. Аднак гэта тэхналогія вядома яшчэ з 19 стагоддзя. Яе заснавальнікам лічыцца Вільям Рэйні Харпер, які ў 1892 годзе ў Чыкагскім універсітэце адкрыў аддзяленне дыстанцыйнага навучання. А яшчэ раней, у 1874 годзе, ва ўніверсітэце штата Ілінойс была прапанавана праграма навучання, якая ажыццяўлялася па пошце; прайшло больш за 30 гадоў, і выкладанне па пошце было прынята ва ўніверсітэце штата Вісконсін.

Асваенне тэхналогіі дыстанцыйнага навучання было і ў Расіі. Першапраходцамі сталі Мараходная школа г.Находкі (1907 г.) і Маскоўскі народны ўніверсітэт імя Шаняўскага (1908 г.).

У 1969 годзе быў створаны Адкрыты ўніверсітэт Вялікабрытаніі (UKOU), які адыграў значную ролю ў развіцці дыстанцыйнага навучання. Сёння тут навучаецца 200 тысяч студэнтаў з розных краін свету, а ўніверсітэт стаў лідарам у сістэме электроннага навучання.

У сучасны момант традыцыйнае дыстанцыйнае навучанне абапіраецца на новыя адукацыйныя тэхналогіі – інфармацыйна-камунікатыўныя і камп’ютарныя тэхналогіі. І ўсё ж такі рэаліі 2020 года прымусілі ўвесь свет звярнуць увагу на дыстанцыйнае навучанне як адзіную магчымасць працягваць атрыманне адукацыі. 192 краіны зачынілі адукацыйныя ўстановы на перыяд пандэміі каронавіруса, больш за 50 краін перайшлі на дыстанцыйнае навучанне. І ніводнай краіне не ўдалося ажыццявіць гэты пераход без праблем.

Як паказаў вопыт 2019 – 2020 навучальнага года, гэтыя праблемы не абышлі і нашу краіну, наш універсітэт. Абазначым толькі некаторыя з іх:

– тэхнічныя (адсутнасць інтэрнэту, нізкая яго хуткасць);

– матэрыяльныя (адсутнасць ці недахоп камп’ютараў ва ўніверсітэце і ў сем’ях студэнтаў і выкладчыкаў);

– арганізацыйныя (механічны перанос вучэбнага раскладу ва ўмовы дыстанцыйнага навучання, што патрабуе знаходжання перад камп’ютарам і студэнтаў і выкладчыка да 6-8 гадзін запар; цяжкасці арганізацыі кантролю ведаў, правядзення залікаў, экзаменаў, выніковай дзяржаўнай атэстацыі);

– асобасныя (інертнасць мыслення, нежаданне самаўдасканалення, недысцыплінаванасць студэнтаў).

Калі з дзвюма першымі праблемамі выкладчыкі справіцца не маглі, то вырашыць арганізацыйныя і асобасныя праблемы нам было па сіле. Ужо праз некаторы час дыстанцыйнага навучання было прынята рашэнне будаваць вучэбны працэс так, каб знаходжанне перад камп’ютарам было разумным, рабіліся перапынкі, на навучальнай платформе размяшчаліся тэкставыя матэрыялы або відэазапіс, што дазволіла студэнтам звяртацца да вучэбнага матэрыялу ў любы час. Была адпрацавана і сістэма кантролю ведаў: інтэрактыўнае тэсціраванне, анлайн-канферэнцыі, зносіны ў чаце, стварэнне групы на адукацыйнай платформе, што дало магчымасць выкладчыку кантраляваць актыўнасць студэнтаў, праверыць выкананне тэставых заданняў, частотнасць звароту да вучэбных дапаможнікаў.

І, канешне, нельга абысці праблемы асобасныя. Ці то нежаданнеісці ўпоравень з часам, ці надзея на тое, што можна, працуючы па-старому, адсядзецца, прывялі да таго, што, калі здарылася такая бяда, як пандэмія, у часткі выкладчыкаў з’явілася разгубленасць і няўпэўненасць.

І ўсё ж такі: чаго больш у дыстанцыйным навучанні – плюсаў ці мінусаў? На наш погляд, адназначнага адказу на гэтае пытанне быць не можа.

Да мінусаў дыстанцыйнага навучання можна аднесці наступнае:

– парушэнне прывычных форм зносін, г.зн. адсутнасць непасрэднага кантакту выкладчыка са студэнтамі; мы не бачым рэакцыі студэнрта на нашы словы, не можам кантраляваць, чым у дадзены момант займаецца навучэнец, наколькі самастойна ён выконвае заданні і г.д.;

– вялікая нагрузкана зрок і апорна-рухальны апарат (знаходжанне перад маніторам на працягу некалькіх гадзін у статычнай позе);

– залежнасць ад тэхнічных прычын (адключэнне электраэнергіі; адсутнасць інтэрнэту; “завісанне” сайтаў; хакерскія атакі на адукацыйныя платформы; віртуальнае хуліганства; выдаленне выкананых заданняў);

– не кожны студэнт забяспечаны камп’ютарам з надзейнай і якаснай відэакамерай і такім чынам зачастую “прысутнічае” на занятках у выглядзе нерухомай “аватаркі”, пры гэтым і аўдыясувязь далёка не лепшая;

– колькасць студэнтаў у групах мінімум ад 15 да 25-30 чалавек не дазваляе выкладчыку адначасова камунікаваць з імі візуальна;

– недысцыплінаванасць студэнтаў (адмаўленне ад выканання заданняў, спасылка на адсутнасць камп'ютара ці інтэрнэту, нявыхад у фармат дыстанта).

Плюсы дыстанцыйнага навучання:

– высокая тэхналагічнасць адукацыйнага працэсу робіць навучанне больш эфектыўным;

– магчымасць працягваць навучанне пры неспрыяльных умовах (каранцін, хвароба);

– магчымасць працягваць навучанне пры знаходжанні ў іншым населеным пункце – у іншай краіне, у любым раёне краіны (асабліва актуальна для студэнтаў завочнай формы навучання);

– магчымасць атрымаць якасную адукацыю студэнтам - завочнікам (не сакрэт, што некаторыя работадаўцы адмаўляюць студэнтам - завочнікам у вучэбных адпачынках);

– індывідуалізацыя навучання: у адрозненне ад традыцыйнага разумення "індывідуальнага падыходу" індывідуалізацыя пры дыстанцыйным навучанні вызначае магчымасць выпрацаваць індывідуальны графік навучання, не перарываць асноўную прафесійную дзейнасць, жыць у прывычным рытме.

Такім чынам, дыстанцыйнае навучанне і – шырэй – дыстанцыйная адукацыя мае плюсы і мінусы. Канешне, сёння мы не можам сказаць пра поўны пераход на дыстанцыйнае атрыманне адукацыі, але спалучэнне традыцыйнага і дыстанцыйнага навучання дазваляе знайсці новыя падыходы да рашэння праблем у сістэме айчыннай адукацыі, распрацаваць новыя методыкі, што, несумненна, будзе садзейнічаць павышэнню якасці адукацыі.

УДК 811.161.3:367.335

## Да праблемы вывучэння многакампанентных складаных сказаў у сучасным мовазнаўстве

Савіцкая І.У., Сахончык А.П.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Пад многакампанентным складаным сказам (МСС) мы разумеем такую паліпрэдыкатыўную канструкцыю, якая складаецца з трох і больш частак, аб'яднаных у структурнае і сэнсавае адзінства на аснове адной або некалькіх відаў сувязі (злучальнай, падпарадкавальнай, бяззлучнікавай).

У залежнасці ад віду (відаў) сувязі паміж прэдыкатыўнымі часткамі такія канструкцыі можна падзяліць на чатыры тыпы:1) складаназлучаныя